**Шаноўныя сябры,**
**шаноўныя лаўрэаткі прэміі,**
**шаноўныя госці!**

30 гадоў пануе ў Беларусі дыктатарскі рэжым Аляксандра Лукашэнкі, толькі што ў студзені на фіктыўных выбарах ён зноў прызначыў сябе прэзідэнтам. Сродкі масавай інфармацыі цалкам знаходзяцца пад кантролем, шматлікія незалежныя парталы навін заблакаваныя, а кожнаму, хто выказвае крытыку, пагражае турма ці калонія. Зараз у краіне больш за 1200 палітычных зняволеных, ізаляваных ад сваякоў і адвакатаў, на прымусовай працы і часткова без медычнай дапамогі. Звыш дзесяці палітвязняў утрымліваюцца ў ізалятарах, чацвёра летась памерлі ў зняволенні. – Усё гэта менш чым за 1000 кіламетраў па прамой адсюль.

Відавочна, што мы ў Еўропе рухаемся ў напрамку крызісных часоў са шматлікімі рызыкамі. У нас больш няма саюзнікаў сярод буйных дзяржаў - ЗША, Расіі, Кітая, якія хочуць падзяліць свет паміж сабой. Правыя радыкалы і фашысты ўсё больш набіраюць моц і ўплыў ва ўсёй Еўропе (не ў апошнюю чаргу на выбарах у Бундэстаг тут, у Германіі, амаль два тыдні таму), правы жанчын, меншасцяў і зазнаўшых пераслед ставяцца пад сумнеў, дыскурсы робяцца больш жорсткімі і небяспечна сыходзяць у правы бок. А адразу за межамі ЕС, у Беларусі існуе дыктатура, пажаданая Расіяй. А Украіна ўжо тры гады абараняецца ад бязлітаснай захопніцкай вайны з боку Расіі. Нягледзячы на маё перакананне ў сілу дэмакратыі, я ўсё цяжэй даю рады захоўваць надзею і аптымізм у гэтыя часы.

Тым больш мяне ўражлівае грамадзянская актыўнасць сёлетніх пераможцаў прэміі. Дар'я Афанасьева, Ірына Альхоўка і Юлія Міцкевіч з вялікай рашучасцю выступалі за правы жанчын, іх прадстаўніцтва і ўдзел у жыцці грамадства. Яны вядуць гаворку аб дыскрымінацыі па гендарным прыкметам і гвалце, не будучы ўпэўненымі, што яны не стануць мэтай рэпрэсій і не падвергнуць сябе рызыцы нават за мяжой. Яны яшчэ раз паказваюць нам, што шлях да роўнасці і справядлівага грамадства ляжыць не толькі праз заканадаўства і інстытуцыянальныя рэформы, але і праз разнастайную і няспынную практычную дзейнасць грамадзянскай супольнасці.

Адмовіцца ад барацьбы за годнасць, правы і дэмакратыю – гэта не варыянт. Прагматычна даваць рады праблемам, шукаць дыялог з дзяржаўнымі органамі, дабівацца дробных зменаў і дапамагаць людзям – гэта ўжо даўно рэцэпт поспеху ў Беларусі. Фонд Генрыха Бёля падтрымліваў курсы для міліцыі і сацыяльных работнікаў, каб звярнуць іх увагу да гендарнага гвалту – сёння такія праекты немагчыма ўявіць. Пасля фальсіфікаваных прэзідэнцкіх выбараў у 2020 годзе многія адданыя сваёй справе людзі былі вымушаныя пакінуць краіну; праваабарончыя, культурныя, экалагічныя і адукацыйныя арганізацыі былі распушчаны, як і арганізацыі з сацыяльнай сферы. Тым не менш, многія працягваюць сваю працу: у Беларусі і ў выгнанні, напрыклад, у адной са шматлікіх ініцыятыў, якія ўзніклі ў Польшчы і краінах Балтыі.

Такія людзі, як Дар’я, Ірына і Юлія, паказваюць нам, што адмова ад барацьбы за годнасць, правы і дэмакратыю – не варыянт. Нам нельга дазваляць паралізаваць сябе безнадзейнасцю і страхам, нават калі пагроза рэальная або барацьба ўжо здаецца

прайгранай. Дар'я, Ірына і Юлія – гэта жанчыны, якія нават у неспрыяльных абставінах даказваюць рашучасць і робяць усё магчымае. Такім чынам яны прадстаўляюць шматлікіх жанчын з беларускага дэмакратычнага руху. Фатаграфіі апаненткі Лукашэнкі Святланы Ціханоўскай абляцелі свет. Пасля фальсіфікацыі выбараў жанчыны не толькі ўзначалілі масавыя пратэсту, але і самі ўдзельнічалі ў гэтых акцыях. Многія з іх заплацілі за гэта высокую цану. Іх пасадзілі за краты або яны былі вымушаны, як нашыя лаўрэаткі, ратавацца ў выгнанні. Дар’я Афанасьева здолела зрабіць гэта толькі пасля больш як двух гадоў калоніі.

**Тое, што жанчыны становяцца мацней і гучней, надае ім сілы**

Сёння, праз пяць гадоў, сітуацыя ў самой Беларусі, але і для апазіцыі ў выгнанні не стала лягчэйшай. У выніку інсцэнаваных выбараў у студзені Лукашэнка ўмацаваў сваю ўладу на гады наперад. Я спытала нашых лаўрэатак: ці ёсць у вас нягледзячы на гэта надзея? На дэмакратычную і гендарна роўную будучыню Беларусі? Мяне ўразілі іх адказы: надзею ім надае, што нешта змяняецца і ў мужчын – асабліва маладыя людзі радзей адчуваюць праблемы з прызнаннем жаночай самастойнасці і больш не баяцца, напрыклад, дзяліць рахунак у рэстаране са сваёй дзяўчынай. Надзею ім надае веданне, што жанчыны ва ўсім свеце змагаюцца за адну справу, што яны самі з'яўляюцца часткай руху, што яны не самотныя – гэта дае ім сілы. Той факт, што жанчыны становяцца мацнейшымі і гучнейшымі і выказваюць тое, што іх хвалюе, – гэта дае сілы. І яны спадзяюцца, што аднойчы ім больш не давядзецца ўсё гэта рабіць, а змогуць проста жыць, зноў быць дома і выходзіць з сяброўкамі.

Для мяне і для журы Жаночай прэміі імя Ганны Кляйн, самі Юлія, Ірына і Дар’я – гэта тры вельмі важкія падставы для надзеі. Таму што іх дзейнасць сведчыць і пра тое, што рэжым як раз не ў стане знішчыць волю да свабоды, дэмакратычныя каштоўнасці і феміністычныя настроі ў беларускім грамадстве. Сваёй актыўнасцю Юлія, Ірына і Дар'я ўплываюць на грамадска-палітычныя дэбаты ў Беларусі з эміграцыі і ствараюць наратыў, супрацьлеглы расійскаму дыскурсу і глыбока патрыярхальнаму погляду на грамадства, якога прытрымліваецца Лукашэнка. Са сваімі феміністкімі пазіцыямі яны таксама з'яўляюцца важнымі носьбітамі перамен сярод апазіцыі ў выгнанні і змагаюцца там за пытанні гендарнай палітыкі, роўнага прадстаўніцтва і ўдзелу жанчын.

Фемінізм у Беларусі і з Беларусі адбываецца ў кантэксце, калі жанчыны сутыкаюцца са значнымі перашкодамі не толькі ў палітычнай, але і ў сацыяльнай і эканамічнай сферах. У патрыярхальных структурах, якія пранізваюць краіну, жанчынам асабліва цяжка патрабаваць сваіх правоў. Тым не менш Дар’я, Ірына і Юлія ніколі не спынялі сваю дзейнасць. Яны паказалі, што жанчыны не толькі ахвяры рэпрэсій, але і актыўныя дзеячы перамен.

**«Дэмакратыя будзе феміністкая або яе не будзе»**

У лацінаамерыканскіх феміністак ёсць слоган: „El futuro será feminista o no será“. Гэта азначае нешта накшталт: «Будучыня будзе феміністычнай або яго не будзе». Можна таксама сказаць: «Дэмакратыя будзе феміністкая або яе не будзе», бо без прызнання правоў жанчын і ЛГБТІК, без барацьбы з дыскрымінацыяй і гендарным гвалтам, без

роўнага доступу да ўлады і палітычнага ўдзелу для ўсіх людзей – і без такіх жанчын, як Юлія, Ірына і Дар’я, не будзе сапраўднай дэмакратыі ані ў Беларусі, ані дзе-небудзь яшчэ ў Еўропе ці ў свеце.

Прысуджэннем сёлетняй Жаночай прэміі імя Ганны Кляйн мы хочам паслаць сігнал салідарнасці і выказаць павагу да грамадзянскай актыўнасці трох лаўрэатак свабоднай і гендарна роўнай Беларусі ў дэмакратычнай Еўропе. Узнагарода гэтым тром выбітным жанчынам – гэта яшчэ і сігнал народу Беларусі: мы вас не забыліся, мы ўважліва сочым не толькі за расійскімі ракетамі, але і за правамі жанчын і сацыяльнай справядлівасцю.

Дар’я, Ірына, Юлія, ваша праца – гэта пуцяводная зорка надзеі для ўсіх нас. Ад усёй душы віншую з узнагародай і дзякую за ўсё, што вы робіце для жанчын у Беларусі і ва ўсім свеце.

Шчыры дзякуй.